## Мова: родная ці чужая?

***Мялешка Уладзімір Юр'евіч, Голубева Яўгенія Алегаўна***
*Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*
***Научный(-е) руководитель(-и) Ратынская Наталля Валяр'янаўна****, Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*

**Введение**

Кожны народ мае сваю мову. Ён адчувае яе, любіць і паважае. І гэта зразумела, бо менавіта мова дазваляе чалавеку быць чалавекам, і родная мова застаецца ў кожнага ў сэрцы назаўсёды. Але калі ў краіне існуе двухмоўе, ці павінна быць такое, што адна з іх застаецца пакінутай.

**Цель исследования**

Высветліць, як ставяцца да беларуская мовы жыхары горада Мінска, параўнаць адказы рэспандэнтаў з адказамі медыкаў.

**Материалы и методы**

Выкарыстаны метад сацыяльнага даследавання: былі апытаны 217 жыхароў горада Мінска, сярод іх 97 мужчын і 120 жанчын, ва ўзросце ад 17 да 83 гадоў. Задаваліся пытанні наконт таго, якую мову яны лічаць роднай, ці добра валодаюць беларускай мовай, ці ёсць патрэбнасць ім карыстацца беларускай мовай у жыцці, ці жадалі б яны поўнага пераходу жыцця краіны на беларускую мову.

**Результаты**

Сярод апытаных лічаць роднай беларускую мову 34 (15,7%), рускую 164 (75,6%), іншую 19 (8,7%). Пры гэтым з тых, хто лічыць беларускую мову роднай 27 (79,5%) маюць больш за 60 гадоў, 5 (14,7%) 45-60 гадоў. Добра размаўляюць і разумеюць па-беларуску 48 (22,1%), што значна менш аналагічнай колькасці сярод медыкаў (40%), разумеюць, але гавораць на ёй бегла 101 (46,5%), што адпавядае аналагічнай колькасці сярод дактароў (45%), з цяжкасцю разумеюць – 37 (17,0%), зусім не валодаюць мовай 31 (14,4%) чалавек. Штодзённа размаўляюць на беларускай мове толькі 6 (2,8%) апытаных, што таксама менш аналагічнай колькасці сярод медыкаў (5%), перыядычна – 14 (6,5%), эпізадычна – 37 (17,0%) і не карыстаюцца – 160 (73,7%). За пераход грамадска-палітычнага жыцця краіны на беларускую мову выказаліся 18 (8,3%) рэспандэнтаў, што ў два раза менш, чым сярод студэнтаў БДМУ (20%). Сярод тых, хто штодзённа карыстуецца беларускай мовай 3 (50%) маюць больш за 60 гадоў, падобныя вынікі і сярод жадаючых пашырэння яе ўжывання – 11 (61,1%), ці амаль трэцяя частка апытаных з гэтай ўзроставай катэгорыі. Сярод асоб маладога ўзросту (17-45 гадоў) за распаўсюджванне беларускай мовы ў жыцці краіны выказаліся 5 (27,8%) апытаных, што складае ўсяго 3,6% з дадзенай групы.

**Выводы**

1. Беларуская мова знаходзіцца ў стане заняпаду, гавораць на ёй менш за 3% апытаных.

2. Сярод дактароў і студэнтаў-медыкаў значна больш аматараў роднай, беларускай мовы.

3. Патрэбна пашыраць ўжыванне беларускай мовы, пакуль яна наогул не загінула.

Репозиторий БГМУ